Безумоўна, выдзяленне названых этапаў практычнага засваення педагагічнай спецыяльнасці патрабуе больш грунтоўнага падыходу да зместу кожнага з іх. Але з пункту гледжання паслядоўнасці, сістэмнасці, паступовага ўскладнення заданняў арганізацыя бесперапыннай педагагічнай практыкі стварае больш спрыяльныя ўмовы для фарміравання прафесійна-педагагічнага мыслення, пабуджае да максімальнай асабістай адказнасці і актыўнасці.

**А.У.Рыбчынская,**
**ст.выкладчык Беларускага універсітэта культуры**

## НОВЫЯ ФОРМЫ СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў ПЕРЫЯД ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ СТУДЭНТАЎ

Праблема арганізацыі педагагічнай і вытворчай практыкі ўзнікае на той момант, калі ў ВНУ паступае студэнт. Здаецца, проста размеркаваць студэнтаў па школах, якіх вялікая колькасць і якія прагнуць атрымаць творчага спецыяліста, асабліва ў галіне харэаграфіі, музыкі, харавога мастацтва, сацыяльнага педагога, па Дамах культуры і клубах, ажыццяўляць кантроль над праходжаннем практыкі. Але сёння сітуацыя ў параўнанні з мінулымі гадамі адрозніваецца тым, што спецыялісты на месцах, дзе мы выбіраем базы практык, пакідаюць гэтую работу. Студэнты-практыканты аказваюцца сам на сам з вучнем ці з групай вучняў без падтрымкі спецыяліста, а колькасць гадзін педагога, які вядзе практыку ў ВНУ, вельмі малая, каб аказваць дзейсную і рэальную дапамогу. На IV курсе студэнты (у большасці выпадкаў) не зусім сфарміраваліся як педагогі-выкладчыкі. Некаторыя методыкі выкладання спецыяльных дысцыплін ім яшчэ не чыталіся. Таму, на мой погляд, перш чым уносіць якія-небудзь прапановы па правядзенні практыкі, неабходна прывесці ў адпаведнасць вучэбныя планы. Менавіта дысцыпліны, звязаныя з методыкай выкладання, неабходна чытаць да пачатку праходжання практыкі.

Асаблівую ўвагу заслугоўвае падыход да выбару педагога па праходжанні практыкі. Тут патрэбны вопыт работы ў школе, вучылішчы або ў прафесійным калектыве ці калектыве мастацкай самадзейнасці, а таксама практычныя веды, валоданне сітуацыяй і праблемамі ўстановы, дзе ажыццяўляецца практыка, з тым каб падтрымаць студэнта-практыканта або даць яму крытычныя заўвагі па вядзенні ўрокаў.

Зразумела, лепш, калі педагог вышэйшай навучальнай установы сумяшчае работу ў адным з падраздзяленняў дауніверсітэцкай адукацыі — школе, ліцэі, каледжы, вучылішчы. Уласны прыклад вядзення ўрока, адпрацоўванне методыкі, прапаноўваемай у ВНУ, — самы вынікова і прадукцыйны падыход да паспяховага правядзення практыкі студэнтаў.

На мой погляд, адказнасць па арганізацыі базы практыкі ляжыць на педагогах ВНУ. Бяда ў тым, што ў большасці выпадкаў выкладчыкі ВНУ не маюць на сённяшні дзень практычных урокаў у школе (маю на ўвазе спецыяльныя школы — музычныя, харэаграфічныя, мастацкія), вельмі малая колькасць выкладчыкаў практыкуе ў музычных вучылішчах, вучылішчах мастацтваў і мае свае творчыя калектывы. Менавіта выкладчыкі, якія маюць вопыт работы ў гэтых структурах, маглі б удзельнічаць у апрацоўцы праграм, стварэнні пастаянных комплексных баз практыкі. Зыходзячы з гэтага, прапаную супрацоўніцтва з сярэдняй школай № 190 з агульнаэстэтычным ухілам, дзе ёсць музычная школа, фальклорныя ўзорныя калектывы, ансамбль народных інструментаў і харэаграфічная школа. Адміністра-цыя школы гатова да творчага супрацоўніцтва. Такая школа можа з'явіцца пастаянна дзеючай творчай лабараторыяй Беларускага універсітэта культуры. Гэта супрацоўніцтва перспектыўнае і рашае некалькі важных задач:

1) узаемадзеянне творчых кафедраў з начальнай базавай адукацыяй;

2) правядзенне творчых семінараў і адкрытых урокаў у школе і вышэйшай навучальнай установе;

3) правядзенне майстар-класаў выкладчыкамі ВНУ для студэнтаў, настаўнікаў і вучняў школы;

4) абмен педагагічным вопытам работы паміж выкладчыкамі ВНУ і школы.

Неабходна кафедрам у кантакце з кіраўнікамі баз вызначыць канкрэтныя мэты і задачы практыкі, забяспечыць неабходнымі матэрыяламі студэнтаў-практыкантаў з тым, каб яны атрымалі поўнае ўяўленне аб педагагічнай працы ў сваёй сферы.

Па арганізацыі і правядзенні педагагічнай практыкі ў Беларускім універсітэце культуры прапаную:

— прывесці ў адпаведнасць вучэбныя планы з тым, каб лекцыйны матэрыял па методыцы выкладання спецыяльных дысцыплін чытаўся да пачатку праходжання практыкі;

— размеркаванне нагрузкі настаўнікам (выкладчыкам па педагагічнай практыцы) здзяйсняць сярод тых, хто мае вопыт работы ў школе, прафесійным вучылішчы, калектывах мастацкай самадзейнасці;

— студэнтам, якія закончылі прафесійныя вучылішчы, даваць магчымасць праходжання практыкі з другога семестра I курса;

— пры вызначэнні базы практыкі (творчай і педагагічнай) неабходна ажыццяўляць сумесныя міжкафедральныя кансультацыі (два разы ў год — у снежні і маі) з мэтай адбору матэрыялу аб найбольш падрыхтаваных базах;

— аказваць падтрымку выкладчыкам ВНУ, якія арганізуюць месцы праходжання педагагічнай практыкі;

— стварыць механізм рэалізацыі (пакет дакументаў) аб супрацоўніцтве школ і вучылішчаў з вышэйшай навучальнай установай;

— дакладней выкарыстоўваць у справаздачах па практыцы відэаматэрыялы. Падраздзяленню тэхнічных сродкаў прыступіць да збору матэрыялаў аб стане баз практыкі для відэатэкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ